МІНІСТЭРСТВА АСВЕТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Гістарычны факультэт
Кафедра гісторыі Беларусі

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ РАСПРАЦОЎКА ПА КУРСУ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ" ПА ТЭМЕ "МАТЭРЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА НАСЕЛЬНІЦТВА І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ (1961-1985 г.г.).

Мінск 1992

Аўтары-складальнікі: Абецадарская А.Л., Рудкін В.Р.,
Цяплова В.А.

Зацверджана Саветам гістарычнага факультэта
29 снежня 1991 г. пратакол № 4.

Вучэбнае выданне

Абецадарская Алена Лаўрэнцьеўна
Рудкін Валянцін Рыгоравіч
Цяплова Валянціна Анатольеўна

Вучэбна-метадычная распрацоўка
па курсу "Гісторыя Беларусі"
па тэме "Матэрыяльнае становішча
насельніцтва і культура Беларусі
(1961-1985 гг.)

Адказны за выпуск В.Р.Рудкін
Падпісана да друку 8.1.92.г.Фармат 60х84/16.Папера тып.N 3.
Друк афсетны. Ум.друк. арк. 1,39. Вуч.-выд.арк. 1,2.
Тыраж 300 экз. Заказ № 314. Бясплатна.
БДУ. 220080 Мінск,праспект Ф.Скарыны,4
Аддрукавана на ратапрынце БДУ,
220080, Мінск,Бабруйская, 7.

# МАТЭРЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА НАСЕЛЬНІЦТВА І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ (1961 - 1985 г.г.)

## І. Матэрыяльнае становішча насельніцтва

Народны дабрабыт -- паняцце шматграннае. Яно характарызуецца даходамі насельніцтва, забяспечанасцю яго жыллём, якасцю абслугоўвання медыцынскімі і культурна-асветнымі установамі, магчымасцю атрымання адукацыі, ўмовамі працы.

Вядома, што адзінай крыніцай росту народнага дабрабыту, ажыццяўлення ўсіх сацыяльных пераўтварэнняў з"яўляецца нацыянальны даход, які ствараецца ў сферы матэрыяльнай вытворчасці. У БССР на падставе росту эканомікі з 1960 па 1985 гг. выраблены нацыянальны даход павялічыўся ў 2,6 раза, прычым тэмпы яго росту былі больш высокімі, чым у цэлым па краіне.

Асноўнай крыніцай рэальных даходаў насельніцтва з"яўляецца заработная плата. З 1965 г. да 1985 г. мінімум яе ў рабочых і служачых Беларусі быў павышаны з 40--45 руб. да 150--166 руб. Адначасова адбывалася павышэнне заработнай платы работнікам асветы, аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гандлю, грамадскага харчавання і іншых галін народнай гаспадаркі і культуры.

Важнымі сацыяльна-эканамічнымі мерамі, якія істотна паўплывалі на паляпшэнне матэрыяльнага становішча працоўных, з"явіліся перавод усіх рабочых і служачых у другой палове 60-х гг. на рабочы тыдзень з двума выхаднымі без зніжэння заработнай платы, а таксама павелічэнне да 15 рабочых дзён працягласці водпуску рабочым і служачым, якія да гэтага карысталіся водпускам у 12 рабочых дзён.

Істотныя змяненні адбыліся ў аплаце працы калгаснікаў. З 1966 г. у калгасах рэспублікі былі ліквідаваны адрозненні ў аплаце працы членаў сельгасарцелей у параўнанні з адпаведнымі катэгорыямі работнікаў саўгасаў, устаноўлена штомесячная гарантаваная аплата работнікаў у залежнасці ад стажу, кваліфікацыі, аб"ёму і складанасці выконваемых работ і адзіныя ўмовы аплаты працы спецыялістаў, старшынь калгасаў і іншых кіруючых работнікаў.

У выніку ў 1970 г. сярэднямесячная аплата працы ў калгасах складала ўжо больш як 75% узроўню працы рабочых саўгасаў, а ў 1985 г. яна практычна зраўнялася з даходамі рабочых і служачых. Прычым тэмпы яе прыросту былі вышэйшыя, чым у рабочых і служа-

чых. У той жа час аплата працы апярэджвала рост прадукцыйнасці працы. Увядзенне гарантаванай грашовай аплаты працы ў калгасах паступовае павелічэнне яе абсалютных памераў садзейнічала зблі жэнню рабочых і сялян не толькі ў адносінах да сродкаў вытвор часці, але і па маштабах атрымання і памерах той долі грамадскага багацця, якія яны мелі.

Адначасова з павышэннем заработнай платы працоўных праводзілася зніжэнне цэн на некаторыя тавары масавага спажывання. У 1965 г. былі зніжаны цэны на шарсцяныя, шаўковыя, ільняныя тканіны, асобныя віды адзення і г.д. Са студзеня 1966 г. былі адменены надбаўкі на цэны ў сельскай мясцовасці, што з"явілася яшчэ адным крокам у збліжэнні ўмоў жыцця сельскага і гарадскога насельніцтва. У той жа час у пачатку 60-х гадоў былі некалькі павышаны рознічныя цэны на прадукты жывёлагадоўлі.

Пад"ём дабрабыту працоўных Беларусі ішоў таксама і праз грамадскія фонды спажывання. Выплаты і льготы з якіх у 1960 г. склалі ў сярэднім на аднаго чалавека 94,6 руб., у 1985 г. -- 511.

Вялікая роля грамадскіх фондаў спажывання ў стварэнні неабходных умоў для выхавання падрастаючага пакалення. Расходы дзяржавы на аднаго вучня ў год у 60-я гг. складалі ў агульнаадукацыйнай школе больш як 180 руб., у сярэдніх спецыяльных навучальных установах -- 670 руб., у вышэйшых -- больш як 1000 руб. Прыкметна палепшыліся матэрыяльныя і бытавыя ўмовы студэнтаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў. У прыватнасці, на 25% павысілася стыпендыя студэнтам вну і на 50%-- студэнтам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Значная частка грашовых выплат з грамадскіх фондаў спажывання прыпадала на выплаты пенсій і дапамог. У 1985 г. такія выплаты ў Беларусі дасягнулі 2073 млн. руб.

Да 1964 г. не было адзіных умоў і норм матэрыяльнага забеспячэння састарэлых і непрацаздольных калгаснікаў. Многія калгасы прымалі свае палажэнні аб пенсійным забеспячэнні ў залежнасці ад эканамічнага стану гаспадарак. У той жа час калгасы, якія мелі невялікія даходы, пенсійнае забеспячэнне састарэлых і інвалідаў практычна не ажыццяўлялі.

Развіццё грамадскай гаспадаркі калгасаў, рост эканомікі краіны далі магчымасць практычна вырашыць пытанне аб стабільнай сістэме пенсійнага забеспячэння калгаснікаў.



У ліпені 1964 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон "Аб пенсіях і дапамогах членам калгасаў". Гэты дакумент паклаў пачатак дзяржаўнай сістэме пенсійнага забеспячэння калгаснікаў. Яны атрымалі ў галіне сацыяльнага забеспячэння такія ж правы, як і рабочыя і служачыя дзяржаўных прадпрыемстваў і устаноў. Быў створаны цэнтралізаваны саюзны фонд сацыяльнага забеспячэння калгаснікаў за кошт штогадовых асігнаванняў па дзяржаўнаму бюджэту СССР і адлічэнняў ад даходаў калгасаў. У 1971 г. у гэты фонд калгасы БССР адлічылі 4,8% свайго валавога даходу, а ў 1980 г. -- ужо 8,1%. Тым не менш памер пенсій калгаснікаў быў невялікім адносна пенсій рабочых і служачых, таму большасць калгасаў практыкавала даплату да пенсій. Шэраг гаспадарак пачалі устанаўліваць персанальныя пенсіі, якія былі вышэй за звычайныя на 15--20 руб. З 1970 г. у рэспубліцы была ўведзена адзіная сістэма сацыяльнага страхавання калгаснікаў.

У разглядаемы перыяд былі павышаны мінімальныя памеры пенсій для шэрагу катэгорый пенсіянераў, а таксама пашыраны льготы інвалідам Вялікай Айчыннай вайны. Яны атрымалі перавагі пры аплаце жылля і камунальных паслуг, у праездзе ў транспарце, у санаторна-курортным лячэнні, медыцынскім абслугоўванні.

Істотныя змяненні адбыліся ў становішчы жанчын і дзяцей. Са студзеня 1965 г. упершыню для калгасніц былі ўведзены дапамогі па цяжарнасці і родах за кошт сродкаў калгасаў і дзяржавы. З 1973--1974 гг. дапамогі па цяжарнасці і родах сталі выплачваць жанчынам у памеры поўнага заробку незалежна ад стажу работы: колькасць аплачваемых дзён па догляду за хворым дзіцем павялічылася, уведзены падамогі на дзяцей да 8 год тым сем"ям, дзе сукупны даход на члена сям"і не перавышаў 50 руб. у месяц. Ім выдавалася аднаразовая дапамога пры нараджэнні трэцяга дзіцяці і штомесячная дапамога пры нараджэнні кожнага наступнага. Жанчыны атрымалі права пайсці на пенсію раней за мужчын на 5 год, пры меншым стажы работы.

У рэспубліцы прыкметна павялічылася колькасць дашкольных устаноў. Да пачатку 80-х гг. налічвалася больш як 5 тысяч пастаянных дашкольных устаноў, у якіх выхоўвалася больш як 600 тыс. дзяцей. Аднак ахоп дзяцей пастаяннымі дашкольнымі устано-

вамі /у працэнтах да колькасці насельніцтва адпаведнага узросту/ складаў крыху больш чым 70%, у тым ліку у гарадскіх паселішчах -- 80%, а у сельскіх -- 48%. 90% сельскіх паселішчаў з агульнай колькасцю насельніцтва больш як 2,4 млн. чалавек не мелі дашкольных устаноў. Яны адсутнічалі у кожным трэцім цэнтры сельскіх Саветаў, у кожным шостым цэнтры саўгасаў і амаль у палавіне цэнтраў калгасаў.

У рэспубліцы вялося інтэнсіўнае жыллёвае будаўніцтва. За 1960--1970 гг. было ўведзена у эксплуатацыю каля 36 млн. кв.м жылля, што у 1,5 раза перавысіла ўвесь жылы фонд у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, які меўся у 1960 г. За гады адзінаццатай пяцігодкі у гарадах здадзена у эксплуатацыю больш як 23 мільёны квадратных метраў жылой плошчы, што на 2,5 млн. квадратных метраў больш, чым намячалася па пяцігадоваму плану. У сельскай мясцовасці пабудавана жылля каля 6 млн. квадратных метраў. Свае жыллёвыя ўмовы палепшыў кожны пяты жыхар рэспублікі. Па паказчыку забяспечанасці на аднаго жыхара карыснай плошчай рэспубліка ужо у 70-я гады выйшла на сярэднесаюзны ўзровень. Але ўсё ж патрэбнасці насельніцтва рэспублікі у жыллі не былі задаволены.

Каб паскорыць тэмпы жыллёвага будаўніцтва, праводзіўся курс на яго індустрыялізацыю, механізацыю працэсаў зборкі і мантажу, на будаўніцтва дамоў з блокаў, частак і дэталей, поўнасцю зробленых на заводах. Вялікім рэзервам у вырашэнні жыллёвай праблемы з"явілася кааператыўнае будаўніцтва. У рэспубліцы яно атрымала шырокае развіццё з 1962 г. пасля пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР "Аб індывідуальным і кааператыўным будаўніцтве".

Уводзімае у строй новае жыллё, як правіла, адрознівалася палепшанай планіроўкай кватэр, дапаможнай плошчай, якая павялічвалася, павышаным узроўнем інжынернага абсталявання. У той жа час кватэрная плата у СССР заставалася адной з нізкіх у свеце.

Адным з паказчыкаў паляпшэння матэрыяльнага становішча працоўных з"яўляецца рост працоўных зберажэнняў у дзяржаўных ашчадных касах. Калі у 1970 г. уклады насельніцтва у ашчадныя касы складалі 1,457 млн. руб., то ужо у 1985 г. -- 9620 млн. руб. Рост укладаў насельніцтва быў звязаны не толькі з ростам



грашовых даходаў, але і з тым, што працоўныя не маглі накіраваць частку грашовых сродкаў на пакупку шэрагу прамысловых і сельскагаспадарчых тавараў. Недастатковая збалансаванасць даходаў насельніцтва і таварных рэсурсаў прывяла да з"яўлення таварнага дэфіцыту. Часткова гэта з"явілася вынікам пераважнай арыентацыі вытворчасці на колькасныя паказчыкі.

Рост рэальных даходаў насельніцтва абумовіў пад"ём яго асабістага спажывання. Пераканаўчым доказам гэтага з"явілася павелічэнне тавараабароту. Толькі за перыяд 1970--1985 гг. рознічны тавараабарот рэспублікі павялічыўся больш чым у 1,8 раза. Тэмпы яго росту былі вышэй за агульнасаюзны ўзровень. Узрос продаж насельніцтву тавараў культурна-бытавога прызначэння, асабліва прадметаў працяглага карыстання-- радыёпрыёмнікаў, тэлевізараў, пральных машын, халадзільнікаў, ювелірных вырабаў. У той жа час не усе выпускаемыя вырабы адпавядалі ўзросшым запатрабаванням спажыўцоў. Прылаўкі і склады магазінаў былі заваленымі нехадавымі таварамі, а пакупнікі не маглі знайсці вырабаў па густу. Разам з тым, рост вытворчасці некаторых тавараў адставаў ад павелічэння грашовых даходаў насельніцтва. Гэта абумоўлівалася галоўным чынам адставаннем развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама прамысловасці, якія выраблялі прадметы спажывання. Усё гэта адбілася на замаруджванні у канцы 70-х гадоў сярэднегадавых тэмпаў прыросту тавараабароту.

Хуткімі тэмпамі павялічваўся тавараабарот на душу сельскага насельніцтва , што сведчыла аб працэсе выраўноўвання жыццёвага ўзроўню у горадзе і вёсцы, які пачаўся. Калі у 1956 г. тавараабарот на душу насельніцтва у сельскай мясцовасці БССР быў у 4,8 раза меншы чым у гарадах, то у 1978 г. гэты разрыў скараціўся да 2,85 раза. Пры гэтым варта ўлічыць, што значная частка харчавання спажывалася сельскім насельніцтвам са сваёй падсобнай гаспадаркі і не праходзіла праз паказчык тавараабароту.

Істотныя змяненні адбыліся у развіцці гандлю. У 1980 г. дзяржаўны і кааператыўны гандаль прамысловых тавараў і прадуктаў харчавання ў разліку на душу насельніцтва у сярэднім узрос на 1 220 руб., у той час як у 1960 -- 269 руб. Асабліва нізкая ступень забеспячэння насельніцтва па усяму колу галін абслугоўвання была характэрна для Брэсцкай і Гомельскай абласцей. Параўнальна нізкі узровень забеспячэння насельніцтва асноўнымі

відамі сферы абслугоўвання мелі такія гарады рэспублікі, як Брэст, Баранавічы, Пінск, Орша, Барысаў, Бабруйск. Гэта было абумоўлена паскораным развіццём горадаўтваральных галін, галоўным чынам прамысловасці і недастатковым выдзяленнем капітальных укладанняў на будаўніцтва аб"ектаў сацыяльнай інфраструктуры.

З ростам даходаў насельніцтва і яго занятасці ўзрасталі патрэбнасці ў бытавых паслугах. У гэтай сферы спажывання ў рэспубліцы было зроблена нямала. Калі ў 1965 г. спажыванне на душу насельніцтва бытавых паслуг складала 6 руб. 40 кап., то ўжо ў 1984 г. -- 44,6 руб.

Служба быту перарасла ў адну з важнейшых галін народнай гаспадаркі. У канцы 70-х гадоў у рэспубліцы мелася 36 вытворчых аб"яднанняў і спецыялізаваных прадпрыемстваў, 126 раённых камбінатаў і вытворчых упраўленняў, у якіх знаходзілася больш як 11 тыс. дамоў быту, атэлье, майстэрань, прыёмных пунктаў, дзе выкарыстоўваліся дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу. Былі асвоены новыя віды рамонту абутку, адзення і бытавой тэхнікі. У канцы дзесятай пяцігодкі насельніцтву было аказана больш як 730 відаў паслуг, з 1980 г. агульны аб"ём паслуг вырас на 36%. Аднак узровень бытавога абслугоўвання прыкметна адставаў ад патрабаванняў часу. У сферы паслуг яшчэ быў параўнальна нізкі ўзровень механізацыі працы, дрэннае матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне. Бытавое абслугоўванне ў сельскай мясцовасці сур"ёзна адставала ад узрослых патрэб. Да таго ж часта парушаліся тэрміны выканання заказаў, пакідалі жадаць лепшага адносіны работнікаў службы быту да наведвальнікаў і г.д.

Вялікая ўвага ў рэспубліцы надавалася ўдасканаленню работы ў галіне аховы здароўя. На гэтыя мэты выдзяляліся вялікія сродкі, якія толькі ў 1970 г. склалі 293,4 млн. руб., што ў 2,5 раза больш чым у 1960 г. Асабліва хутка раслі асігнаванні ў 70-я -- пачатку 80-х гг. На развіццё аховы здароўя і фізічнай культуры зрасходавана амаль 3,9 млрд. руб. Усё гэта дало магчымасць значна павялічыць колькасць новых бальніц, паліклінік і іншых лячэбных устаноў, а таксама правесці канцэнтрацыю, цэнтралізацыю і спецыялізацыю ўсёй сістэмы аховы здароўя. Бальніцы і паліклінікі аснашчаліся навейшым абсталяваннем, забяспеч-



валіся высокакваліфікаваным медыцынскім персаналам. Колькасць урачоў усіх спецыяльнасцей склала на канец 1985 г. 38,6 тыс. чалавек, супраць 16,4 у 1960 г.

Ва ўмацаванні здароўя немалую ролю адыгрывалі санаторыі, дамы адпачынку, турыстычныя базы. Калі ў 1965 г. у гэтых установах пабывала каля 170 тыс. чалавек, то ўжо ў 1984 г. -- больш як 2 млн.

Прыкметныя поспехі дасягнуты і ў развіцці фізічнай культуры і спорту. Дасягненні беларускіх спартсменаў атрымалі шырокую вядомасць. У летапіс савецкага спорту ўпісаны імёны беларускіх спартсменаў, якія неаднаразова дабіваліся перамог на алімпійскіх арэнах: Н.Кім, А.Бяловай, В.Сідзяка, В.Корбут, А.Мядзведзя і інш.

Поспехі ў спорце ў многім забяспечваліся развіццём спартыўнай базы. У распараджэнні спартсменаў і фізкультурнікаў у 1985 г. было 165 стадыёнаў, 4104 тыс. футбольных палёў, 14,9 тыс. баскетбольных, валейбольных і тэнісных пляцовак.

Разам з павышэннем узроўню майстэрства спартсменаў у рэспубліцы паспяхова вырашалася сацыяльна важная задача масавага развіцця фізічнай культуры і спорту сярод працоўных і моладзі. Сотні тысяч чалавек штогод здавалі нормы ГПА. У 1985 г.у 12 тыс. калектываў фізкультуры займалася 3370 млн. чалавек /1970 -- 2351 тыс. чалавек/.

Асноўная маса працоўных і моладзі далучалася да заняткаў фізкультурай і спортам праз калектывы фізкультуры і спартыўныя клубы, створаныя на прадпрыемствах, ва ўстановах, калгасах і ў саўгасах, у навучальных установах.

З 1977 г. атрымалі распаўсюджанне заняткі фізічнай культурай па месцы жыхарства насельніцтва. У жылых мікрараёнах гарадоў ствараліся фізкультурна-аздараўленчыя камбінаты /ФАК/. У 1980 г. у рэспубліцы ўжо налічвалася 15 такіх камбінатаў, у якіх людзі за мінімальную плату наведвалі заняткі ў групах здароўя, агульнай фізічнай падрыхтоўкі, атлетычнай гімнастыкі і г.д.

## 2. Народная адукацыя і навука. Культурна-асветная работа

У рэспубліцы працягвалася работа па ўдасканаленню сістэмы народнай адукацыі, у аснову развіцця якой быў пакладзены прынцып непарыўнасці адзінства навучання і выхавання.

У 1985/1986 навучальным годзе у рэспубліцы налічвалася 8936 агульнаадукацыйных школ, у той час як у 1960/1961 навучальным годзе -- 13 063. Памяншэнне іх колькасці тлумачыцца не толькі тым, што быў узяты курс на стварэнне больш буйных, добра абсталяваных і аснашчаных школ с кабінетнай сістэмай, але і з рэзкім змяншэннем сельскага насельніцтва.

Істотныя змяненні адбыліся ў пачатковай школе. З 1968/1969 навучальнага года ў гэтых школах быў скарочаны тэрмін навучання да трох год. Пачынаючы з 1976/77 навучальнага года пачаўся пераход навучання дзяцей з шасцігадовага ўзросту. Пераўтварэнні закранулі і сярэднюю школу.

Да 1963/1964 навучальнага года сярэднія школы былі пераўтвораны ў адзінаццацігадовыя з вытворчым навучаннем. Аднак практыка іх работы паказала, што гэта рэарганізацыя сябе не апраўдала. Таму ў 19.4 г. школы былі зноў пераведзены на дзесяцігадовы тэрмін навучання. Да канца 60-х гадоў у Беларусі фактычна была вырашана праблема ўсеагульнага абавязковага васьмігадовага навучання дзяцей, тым самым ствараліся ўмовы для ажыццяўлення ўсеагульнай абавязковай сярэдняй адукацыі, пераход да якой быў завершаны да 1977 г.

Усебаковаму развіццю вучняў у рэспубліцы садзейнічала шырокая сетка палацаў і дамоў піянераў, станцый юных тэхнікаў і натуралістаў, дзіцяча-юнацкіх спартыўнах школ, дзіцячых паркаў, стадыёнаў, піянерскіх лагераў.

У сістэме падрыхтоўкі рабочай і сельскай моладзі важнае значэнне мела прафесіянальна-тэхнічная адукацыя, якая знаходзілася ў цеснай сувязі з патрэбамі развіцця народнай гаспадаркі. Колькасць гэтых навучальных устаноў пастаянна расла, умацоўвалася іх матэрыяльнай база. У пачатку 1961 г. у рэспубліцы працавала 103 прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, да канца 1985 г. колькасць іх вырасла да 240.

Спецыялістаў сярэдняга звяна ў рэспубліцы рыхтавалі 136 тэхнікумаў і вучылішчаў. Найбольш буйныя з іх -- Маладзечанскі палітэхнікум, Гарадоцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі, Мінскі радыётэхнічны, архітэктурна-будаўнічы, палітэхнікум і іншыя. За гады адзінаццатай пяцігодкі ў рэспубліцы былі адкрыты 4 педвучылішчы /Баранавіцкае, Лідскае, Нясвіжскае, Мінскае/.



Паспяхова развівалася вышэйшая школа рэспублікі. Да пачатку 80-х гадоў у БССР функцыяніравала 33 вышэйшыя навучальныя установы. Буйнейшай з іх з"яўляўся Беларускі політэхнічны інстытут /24 тыс. студэнтаў/, а таксама Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У.І.Леніна /17 тыс. студэнтаў/. Задачы навукова-тэхнічнага прагрэсу выклікалі неабходнасць падрыхтоўкі кадраў па новых спецыяльнасцях. У сувязі з гэтым у рэспубліцы быў адкрыты шэраг буйных тэхнічных вну: Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, Мінскі радыётэхнічны, Віцебскі тэхналагічны лёгкай прамысловасці, Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут, Магілёўскі тэхналагічны, Наваполацкі політэхнічны інстытут, Гомельскі політэхнічны інстытут. Колькасць студэнтаў у вну рэспублікі ў 1985 г. склала 182 тыс. чалавек. Вялікая ўвага ўдзялялася ўдасканаленню матэрыяльна-тэхнічнай базы вышэйшых навучальных устаноў, аснашчэнню лабараторый новым навуковым абсталяваннем. Адбыліся значныя пазітыўныя змяненні ў арганізацыі навуковага працэсу ў вышэйшых навучальных установах. Была перапрацавана большасць навуковых праграм. Значная частка студэнтаў выконвала курсавыя і дыпломныя работы па заданнях прадпрыемстваў, для вытворчай практыкі за вну былі замацаваны перадавыя прадпрыемствы, штогод студэнты удзельнічалі ў выкананні дзяржбюджэтных і гасдагаворных тэм. У рэспубліцы сістэматычна праводзіліся агляды-конкурсы студэнцкіх навукова-даследчых работ.

Вялікая ўвага была ўдзелена павышэнню якасці навучання, маральнага і эстэтычнага выхавання моладзі, падрыхтоўцы яе да грамадска карыснай працы.

Глыбокія пераўтварэнні, якія ўносіла навукова-тэхнічная рэвалюцыя ва ўсе бакі грамадства, абумовілі якасныя змяненні ролі навукі. У развіцці эканомікі і культуры яна набыла ўзрастаючае значэнне. Вучоныя сканцэнтравалі намаганні на вырашэнне важных комплексных праблем навукова-тэхнічнага прагрэсу. У сувязі з гэтым у Беларусі праводзілася вялікая работа па пашырэнню сеткі навукова-даследчых устаноў, умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы навукі, падрыхтоўцы навуковых кадраў. У 1985 г. у рэспубліцы налічвалася больш як 40 тыс. навуковых работнікаў, у той час як у 1960 г. -- 6 840. Сярод іх каля 1 тыс. мелі ступень доктара навук і амаль 13 тыс. -- кандыдата навук.

Асноўным навуковым цэнтрам была Акадэмія навук БССР, дзе

праводзіліся шырокія даследаванні па шэрагу вядучых напрамкаў прыродазнаўчых навук.

У сістэме Акадэміі навук у 1985 г. працавала 124 акадэмікі, сапраўдных членаў і членаў-карэспандэнтаў, 2349 дактароў і кандыдатаў навук. Паскоранае развіццё АН БССР, паспяховае развіццё навукі і тэхнікі стварылі перадумовы утварэння яе філіялаў у Віцебску, Гомелі, Гродна, Магілёве.

АН БССР пастаянна ўдасканальвала сувязі навукі з вытворчасцю. Найбольш шырокае распаўсюджанне яны атрымалі па лініі гаспадарчых дагавораў, многія прыкладныя даследаванні вяліся па агульных планах, распрацаваных АН БССР і міністэрствам ці буйным вытворчым аб"яднаннем. На базе ўстаноў Акадэміі і буйных прадпрыемстваў утварыліся навукова-вытворчыя аб"яднанні, якія працавалі на грамадскіх пачатках. Навуковыя работнікі АН БССР паспяхова працавал над выкананнем праграм навуковых даследаванняў. Толькі за гады дзесятай пяцігодкі ў народную гаспадарку краіны ўкаранёна 1 180 навуковых распрацовак, 24 работы ўдастоены Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР і БССР у галіне навукі і тэхнікі, зарэгістравана 2 адкрыцці.

Шырока праводзілі навуковыя даследаванні вну рэспублікі. У пачатку дзесятай пяцігодкі ў сістэме Мінвуза БССР мелася 13 галіновых навукова-даследчых лабараторый. Адной з самых распаўсюджаных форм сувязі вышэйшай школы з прамысловымі прадпрыемствамі, акадэмічнымі і галіновымі НДІ стала заключэнне гаспадарчых дагавораў. У канцы дзесятай пяцігодкі 80% усіх работ, выкананых вну, ажыццяўляліся на іх аснове.

Навуковымі калектывамі і Акадэміяй навук БССР паспяхова вырашаўся шэраг буйных тэарэтычных і прыкладных праблем у галіне фізіка-матэматычных, тэхнічных, хімічных, геалагічных, біялагічных і грамадскіх навук.

У выніку ўкаранення распрацовак, выкананых вучонымі АН БССР і вну, навуковымі ўстановамі міністэрстваў і ведамстваў эканамічны эфект толькі за гады адзінаццатай пяцігодкі склаў каля 290 млн. рублёў. Высокай ацэнкай дасягненняў вучоных служыць, напрыклад, прызнанне навуковым адкрыццём новай фізічнай з"явы, прадказанай акадэмікам АН БССР Ф.І.Фёдаравым, прысуджэнне Дзяржаўнай прэміі СССР акадэмікам АН БССР П.А.Апанасевічу, Б.В.Бакутко, В.А.Піліповічу, Н.Я.Сачанку, Б.І.Сцяпанаву і інш.



За гады адзінаццатай пяцігодкі, вырасла колькасць лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі БССР, прэмій Ленінскага камсамола.

Прыкметныя дасягненні былі дасягнуты ў галіне грамадскіх навук. Вучоныя грамадазнаўцы займаліся даследаваннем сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця беларускага народа. Атрымалі прызнанне навуковай грамадскасці шэраг буйных даследаванняў па філасофіі, гісторыі, эканоміцы, гісторыі беларускай літаратуры. Упершыню ў гісторыі беларускага народа была выдадзена "Гісторыя Беларускай ССР" у пяці тамах /1972--1975 гг./, дванаццацітомная "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" /1969--1975 гг./.

У 60-я пачатку 80-х гадоў атрымала далейшае развіццё культурна-асветная работа. Вядучая роля ў ёй належала клубам, дамам і палацам культуры. Яны актыўна садзейнічалі распаўсюджанню агульнакультурных, палітычных і эканамічных ведаў сярод працоўных, праводзілі работу па эстэтычнаму, патрыятычнаму і інтэрнацыянальнаму выхаванню. Сетка гэтых устаноў пастаянна расла. Калі ў 1961 г. іх было 5,3 тыс., то ўжо ў канцы 1985 г. -- 6,3 тыс.

Большасць клубных устаноў знаходзілася ў сельскай мясцовасці. Тут па меры росту культурнага ўзроўню насельніцтва, умацавання эканомікі калгасаў адбываліся структурныя змяненні ў дзейнасці гэтых устаноў. Сельскі Дом культуры стаў цэнтральнай арганізацыйна-метадычнай клубнай установай на тэрыторыі сельсавета, якой падпарадкоўваліся ўсе астатнія клубы і чырвоныя куткі на правах філіяла.

Пошукі рацыянальных форм арганізацыі культурна-выхаваўчай работы прывялі да стварэння ў межах гаспадарак і сельсаветаў сацыяльна-культурных комплексаў. Напрыклад, у калгасе імя Гастэлы Мінскага раёна такі комплекс аб"яднаў у адзіную структурную сістэму Дом культуры, бібліятэку, кінастацыянар, сельгастэхнікум, сярэднюю і музычную школы, урачэбна-амбулаторны ўчастак, камбінат бытавога абслугоўвання, гандлёвы цэнтр.

Клубныя ўстановы рэспублікі выкарыстоўвалі разнастайныя формы работы з масамі. Практыкаваліся тэматычныя вечары, чытацкія канферэнцыі, кінафестывалі, сустрэчы з перадавікамі вытворчасці і ветэранамі вайны, провады ў Савецкую Армію і г.д.

Вялікую ролю ў культурна-масавай рабоце адыгрывалі масавыя

бібліятэкі, якія праводзілі работу па павышэнню агульнаадукацыйнага, культурнага і навукова-тэхнічнага ўзроўню працоўных. У разглядаемы перыяд гэтыя установы былі амаль ва ўсіх населеных пунктах. У канцы 1985 г. у рэспубліцы налічвалася 6891 масавая бібліятэка, кніжна-часопісны фонд якіх перавысіў 100 млн. экземпляраў.

У 70-х гадах ішло ўдасканаленне структурнай сеткі бібліятэк, праводзілася цэнтралізацыя бібліятэчнай дзейнасці шляхам стварэння на базе гарадскіх і раённых бібліятэк адзінай бібліятэчнай сеткі з агульным штатам, кніжным фондам, цэнтралізаваным камплектаваннем і апрацоўкай літаратуры.

Работнікі бібліятэк пастаянна праводзілі работу па прапагандзе кнігі і твораў мастацтва. Для гэтай мэты яны арганізоўвалі літаратурна-музычныя вечары, кіналекторыі, афармлялі кніжныя выстаўкі, наладжвалі сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі, дзеячамі культуры. Па лепшых творах мастацкай літаратуры бібліятэкі праводзілі чытацкія канферэнцыі. Немалую работу ў гэтым плане прарабіла Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У.І.Леніна, Фундаментальная бібліятэка АН БССР імя Я.Коласа, многія гарадскія і сельскія бібліятэкі.

Вялікае развіццё ў рэспубліцы атрымалі такія сродкі культурнага абслугоўвання насельніцтва, як газеты, часопісы, кнігі. У 1985 г. выдавалася 212 газет, з іх 130 на беларускай мове, кніг і брашур /у друкаваных адзінках/ 3431, на беларускай — 393.

Значна вырасла ў культурным жыцці рэспублікі роля радыё і тэлебачання. Да 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі завяршылася радыёфікацыя населеных пунктаў з дзесяцю і больш дварамі. Да канца 60-х гадоў ужо дзейнічала адзіная сістэма тэлебачання. Мінск і абласныя цэнтры мелі ўстойлівы прыём трох праграм. У 1985 г. у насельніцтва рэспублікі мелася больш як 2652 тыс. тэлевізараў.

Шырокую культурна-асветную работу ажыццяўлялі кінатэатры, а таксама клубы, палацы культуры, ў якіх не толькі дэманстраваліся кінафільмы, але і прапагандаваліся лепшыя творы кінамастацтва. Дзейнічалі кіналекторыі, выстаўкі, праводзіліся сустрэчы з папулярнымі акцёрамі кіно, ствараліся кінаўніверсітэты. Колькасць кінаўстановак павялічылася з 4230 тыс. у 1961 г. да 7377 у 1985 г.



Змястоўную культурна-асветную работу сярод працоўных праводзілі музеі, колькасць якіх пастаянна расла. У 1985 г. іх, уключаючы філіялы, налічвалася 95, у той час як у 1970 г.— 48. Музеі наведала у 1985 г. 4,9 млн. чалавек, у 1970 г. — 3 млн. Акрамя дзяржаўных, на многіх прадпрыемствах, калгасах, саўгасах, вышэйшых навучальных установах ствараліся разнастайныя музеі. Так, сіламі мясцовых краязнаўцаў вёскі Дастоева /Брэсцкай вобласці/ быў адкрыты музей Ф.Дастаеўскага, экспанаты якога знаёмяць наведвальнікаў з жыццём і творчасцю вялікага рускага пісьменніка.

У сярэдзіне 1959 г. узнікла новая форма ідэйна-палітычнай і культурна-асветнай работы — народныя універсітэты. Па колькасці універсітэтаў і слухачоў у іх ужо ў 1965 г. Беларусь займала трэцяе месца ў СССР. Ствараліся яны пры гарадскіх і раённых дамах культуры, на буйных прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах.

Першапачаткова адкрываліся ў асноўным універсітэты культуры, з часам — народныя універсітэты тэхніка-эканамічных, сельскагаспадарчых і прававых ведаў, ваенна-патрыятычнага выхавання, аховы працы і г.д.

Адным з лепшых у рэспубліцы быў народны універсітэт пры Пінскай музычнай школе, які меў некалькі сваіх філіялаў. Ён з"яўляўся метадычным цэнтрам у Пінску, Іванаўскім і Столінскім раёнах. Карысталіся папулярнасцю універсітэты пры Палацах культуры трактарнага і аўтамабільнага заводаў г.Мінска, Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў. Добра працаваў народны універсітэт у Жыровічах, які знаёміў жыхароў вёскі з творчасцю пісьменнікаў, паэтаў, кампазітараў.

### 3. Літаратура і мастацтва

Шырокае прызнанне ў рэспубліцы і за яе межамі атрымалі творы беларускай літаратуры і мастацтва. Сведчаннем высокага грамадскага прызнання з"явілася прысваенне звання Героя Сацыялістычнай Працы П.Броўку, В.Быкаву, К.Крапіве, М.Танку, І.Шамякіну. Ленінскай прэміі былі ўдастоены народныя паэты Беларусі П.Броўка, М.Танк, празаікі І.Мележ, В.Быкаў. Шэрагу пісьменнікаў

і паэтаў былі прысуджаны прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўныя прэміі БССР імя Я.Коласа, Літаратурныя прэміі імя Я.Купалы.

Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў былі перакладзены на многія мовы народаў СССР і свету. Толькі ў 1985 г. кнігі Я.Купалы выдадзены на 18 мовах, Я.Коласа, І.Шамякіна -- на 15, В.Быкава -- на 25, Я.Брыля -- на 14, І.Мележа -- на 11, М.Танка, А.Адамовіча -- на 10.

Беларускія пісьменнікі, паэты і драматургі ў сваёй творчасці звярталіся да тэм Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, пасляваеннага аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР.

Падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, цяжкасці аднаўленчага перыяду і калгаснага будаўніцтва раскрываюць раманы І.Гурскага "Вецер стагоддзя", І.Мележа "Людзі на балоце", "Подых навальніцы", І.Шамякіна "Петраград-Брэст"; аповесці С.Грахоўскага "Рудабельская рэспубліка", цыкл апавяданняў П.Броўкі "Разам з камісарамі.

Беларускія пісьменнікі сказалі слова аб народным подзвігу, мужнасці, непахіснай волі савецкага чалавека, якая праявілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Шырокую вядомасць не толькі ў краіне, але і далёка за рубяжом атрымалі творы В.Быкава "Альпійская балада", "Жураўліны крык", "Трэцяя ракета", "Абеліск", "Воўчая зграя", "Сотнікаў", "Дажыць да світанку". Разважанні аб жыцці, псіхалогіі чалавека на вайне гучаць у творах І.Навуменкі "Сасна пры дарозе", "Вецер у соснах", "Сорак трэці", І.Чыгрынава "Плач перапёлкі", "Апраўданне крыві", Я.Брыля "Птушкі і гнёзды". Гераічным летапісам мінулага, звернутага ў сучаснасць паўстаюць мастацка-дакументальныя аповесці пісьменніка-публіцыста І.Новікава "Руіны страляюць ва упор", "Дарогі скрыжаваліся ў Мінску", "Да досвітку блізка", "Тварам да небяспекі".

Дакументальнай праўдзівасцю і эмацыянальнай усхваляванасцю савецкага чытача ўражвалі кнігі А.Адамовіча "Хатынская аповесць", "Вайна пад стрэхамі", "Сыны ідуць у бой", "Я з вогненнай вёскі" /у сааўтарстве з Я.Брылем і У.Калеснікам/, С.Алексіевіч "У вайны не жаночы твар", "Ваенныя дзённікі" І.Мележа.

Унутранаму свету герояў працоўнага фронту, жыццю рэспублі-



кі прысвечаны раманы В.Карпава, Л.Арабей, А.Васілевіч, А.Савіцкага і інш.

Гістарычная тэма ў беларускай прозе знайшла яркае ўвасабленне ў творах Уладзіміра Караткевіча. Яго вядомыя раманы "Дзікае паляванне караля Стаха", "Чорны замак Альшанскі", "Зямля пад белымі крыламі", "Каласы пад сярпом тваім" і інш. карыстаюцца заслужанай любоўю чытачоў. Традыцыі, закладзеныя У.Караткевічам, прадоўжылі К.Тарасаў, В.Іпатава, К.Дайнека і інш.

Яркімі творчымі індывідуальнасцямі, самабытнасцю мастацкіх прыёмаў багата беларуская паэзія. Паэты стварылі шэраг цікавых твораў, сярод якіх трэба адзначыць зборнікі "Сярод чырвоных рабін" П.Броўкі; "Новая кніга", "Сасна і бяроза" А.Куляшова; "Мой хлеб надзённы", "Глыток вады М.Танка; "Пры святле маланак" П.Панчанкі.

Тэма роднай Беларусі, тонкіх лірычных перажыванняў, асноўная тэматыка П.Глебкі, Н.Гілевіча, А.Лойкі, М.Лужаніна, Р.Барадуліна, Еўдакіі Лось, Анатоля Вярцінскага і многіх іншых беларускіх паэтаў, чые творы характарызуюцца вялікай мастацкай пераканаўчасцю і шчодрасцю таленту.

Мемуарная літаратура, папоўнілася творамі вядомых кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі В.Мачульскага, В.Лабанка, Д.Цябута, І.Клімава і іншых.

У жанры дзіцячай літаратуры паспяхова працавалі Алесь Якімовіч, В.Вітка, М.Танк, Станіслаў Шушкевіч, Уладзімір Ліпскі, Эдзі Агняцвет, Ніл Гілевіч, Артур Вольскі, Алена Васілевіч, Рыгор Барадулін і іншыя.

Новых поспехаў дасягнулі беларуская крытыка і літаратуразнаўства. Павысіліся іх тэарэтычны ўзровень і накіраванасць. Значны ўклад у гэту галіну ўнеслі літаратуразнаўцы Алег Лойка, Алесь Адамовіч, С.Александровіч, В.Калеснік, Адам Мальдзіс, І.Навуменка, Вячаслаў Чамярыцкі і многія іншыя. Іх работы вызначаюцца грунтоўным даследаваннем літаратурнага працэсу, глыбокім аналізам дасягненняў і недахопаў асобных твораў, праблем развіцця жанраў і літаратурных напрамкаў.

У фарміраванні духоўнага свету, грамадзянскіх пазіцый і эстэтычных густаў савецкіх людзей вялікая роля беларускай драматургіі.

П"есы К.Крапівы "Брама бессмяротнасці", А.Макаёнка "Лявоніха

на арбіце", "Таблетку пад язык", "Зацюканы апостал", "Трыбунал"; А.Петрашкевіча "Адкуль грэх", "Трывога"; М.Матукоўскага "Амністыя", "Апошняя інстанцыя"; А.Дзялендзіка "Выклік багам"; В.Ткачова "Вокны"; А.Дударава "Радавыя", "Вечар" і іншыя з"явіліся буйным укладам у скарбніцу савецкай драматургіі. П"есы беларускіх драматургаў з поспехам ішлі на сцэне многіх тэатраў Савецкага Саюза.

Далейшае развіццё атрымала тэатральнае мастацтва. У 1985 г. у рэспубліцы працавала 17 прафесіянальных тэатраў, у той час як у 1960 -- 11. Праўдзівасць, наватарства і творчы падыход, змястоўнасць і эмацыянальнасць, высокае мастацкае майстэрства акцёраў і рэжысёраў -- асноўныя рысы, якія характарызавалі развіццё беларускага тэатральнага мастацтва.

Галоўнае месца ў рэпертуары тэатраў займалі гісторыка-рэвалюцыйныя і ваенна-патрыятычныя творы, прысвечаныя барацьбе народа за сацыяльную і нацыянальную незалежнасць, а таксама класічная руская і замежная драматургія.

Рэпертуар беларускіх тэатраў быў значна абноўлены пастаноўкамі п"ес "Трэцяя патэтычная" М.Пагодзіна ў тэатры імя Я.Купалы; "Шостае ліпеня" М.Шатрова на сцэнах тэатраў імя Я.Коласа і М.Горкага; "Крамлёўскія куранты" М.Пагодзіна і "Дзень цішыні" М.Шатрова ў Брэсцкім тэатры імя Ленінскага камсамола. Беларускімі гледачамі цёпла былі сустрэты спектаклі "Раскіданае гняздо" Я.Купалы у пастаноўцы Беларускага тэатра імя Я.Купалы, "Снежныя зімы" І.Шамякіна у пастаноўцы Беларускага тэатра імя Я.Коласа, "Чалавек з боку" І.Дварэцкага ў пастаноўцы Рускага тэатра БССР імя М.Горкага.

Адно з цэнтральных месцаў у рэпертуары беларускіх тэатраў заняла ваенна-патрыятычная тэма. Кожны з 14 тэатраў рэспублікі паставіў шэраг спектакляў прысвечаных гэтай тэме. Гэта "Апошні шанц" В.Быкава ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Я.Купалы, "Маладая гвардыя" А.Фадзеева ў Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача, "Апошняя суніца ў жніўні" А.Дзяленьдзіка у Магілёўскім абласным тэатры, "Скажы сваё імя, салдат" Анатоля Вярцінскага ў Дзяржаўным тэатры лялек БССР і іншыя.

Але галоўная тэма беларускага тэатра -- увасабленне ў драматычных спектаклях савецкай сапраўднасці. Вялікім поспехам у



гледачоў карысталіся спектаклі "Сталявары" Г.Бокарава у Беларускім дзяржаўным драматычным тэатры імя Я.Коласа, "Пратакол аднаго пасяджэння" А.Гельмана, "Таблетку пад язык" А.Макаёнка ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Я.Купалы, "Апошняя інстанцыя" М.Матукоўскага ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М.Горкага і іншыя.

Прыкметнай падзеяй у тэатральным жыцці рэспублікі пачатку 80-х гадоў з"явіліся спектаклі па аповесці лаўрэата Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР, народнага пісьменніка Беларусі В.Быкава "Знак бяды" ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры імя М.Горкага і п"еса маладога беларускага драматурга А.Дударава "Радавыя". Найбольш блізкай аўтарскай задуме стала яе пастаноўка у Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Я.Купалы, адзначаная Дзяржаўнай прэміяй СССР 1985г.

Значнымі дасягненнямі у галіне тэатральнага мастацтва з"явіліся работы вядомых майстроў беларускай сцэны Г.Глебава, Л.Рахленкі, Б.Платонава, Л.Ржэцкай, П.Малчанава, В.Дзядзюшкі, Г.Макаравай, З.Стомы, М.Яроменкі, Г.Аўсяннікава, М.Захарэвіч, Л.Давідовіч, А.Мілаванава, В.Тарасава, Ф.Шмакава, А.Клімавай, Р.Янкоўскага і многіх іншых.

Беларускае тэатральнае мастацтва вядома далёка за межамі рэспублікі. Выступленні і гастролі у іншых нацыянальных рэспубліках і за мяжой, пастаноўка п"ес народаў СССР і замежных аўтараў беларускімі тэатрамі і беларускіх п"ес за яе межамі, актыўна садзейнічалі працэсу ўзаемаўплыву і узаемаабагачэння культур, пашыралі творчыя сувязі дзеячаў беларускай сцэны. На усесаюзную арэну выйшлі п"есы "Трыбунал", "Зацюканы апостал", "Таблетку пад язык", А.Макаёнка, "Брама неўміручасці" К.Крапівы, "Апошняя інстанцыя" ,"Амністыя" М.Матукоўскага, "Апошні шанц" В.Быкава, "Брэсцкая крэпасць" К.Губарэвіча, "Сэрца на далоні" І.Шамякіна, "Трывога" А.Петрашкевіча і іншыя.

Вялікі уклад у развіццё савецкага шматнацыянальнага мастацтва унесла беларускае кіно. Беларускія кінематаграфісты дасягнулі значных поспехаў у распрацоўцы гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы. Гэтай тэме прысвечаны фільмы старэйшага беларускага кінарэжысёра В.Корш-Сабліна "Першыя выпрабаванні", "Масква-Генуя", "Запомні гэты дзень", "Крушэнне імперыі". На цікавым гістарычным ма-

тэрыяле пастаўлены фільм "Я, Францыск Скарына" /рэжысёр Б.Сцяпанаў/.

У лепшых фільмах, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны, майстры беларускага кіно стварылі глыбокія вобразы-характары гераічных сыноў свайго народа:"Альпійская балада", "Бацька" /рэжысёр Б.Сцяпанаў/, "Трэцяя ракета" /рэжысёр Г.Віктараў/, "Праз могілкі", "Я родам з дзяцінства", дылогіі "Партызаны" /рэжысёр В.Тураў/, "Паланез Агінскага", "Іван Макаравіч" /рэжысёр І.Дабралюбаў/.

Гераічнай барацьбе падпольшчыкаў, партызанскаму руху ў рэспубліцы прысвечаны шматсерыйны тэлевізійны фільм "Руіны страляюць ва ўпор" і двухсерыйная кінаэпапея "Полымя" рэжысёра В.Чацверыкова.

Значнае месца ў беларускім кінамастацтве 60--80-х гадоў займаюць фільмы, прысвечаныя важнейшым падзеям савецкай рэчаіснасці. Сярод іх карціны:"Апошні хлеб", "Воблакі" /рэжысёр /Б.Сцяпанаў/, "Іду шукаць", "Вуліца без канца", "Таму, што кахаю" /рэжысёр І.Дабралюбаў/, "Час яе сыноў" /рэжысёр В.Тураў/, "Сын старшыні" /рэжысёр В.Нікіфараў/.

Беларускія кінадакументалісты стварылі багатыя па тэматыцы, жанрах, метадах асэнсавання рэчаіснасці фільмы:"Балада аб мужнасці і каханні", "Генерал Пушча" /рэжысёр І.Вейняровіч/, "Шчырая размова" /рэжысёр М.Хубаў/, "Дом", "Я з вогненнай вёскі" /рэжысёр В.Дашчук/ і многія іншыя. У 1985 г. В.Дашчук за кінастужкі "Я з забітай вёскі" і "У вайны не жаночы твар" быў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР.

Мінская студыя навукова-папулярных і дакументальных фільмаў выпускала таксама перыядычныя кіначасопісы "Савецкая Беларусь", "Сельская гаспадарка Беларусі", "Мастацтва Беларусі", "Навіны навукі і тэхнікі", якія давалі шмат цікавага і пазнавальнага матэрыялу.

Прыкметна вырасла творчая актыўнасць і майстэрства беларускіх кампазітараў. Шырокае і рознабаковае ўвасабленне ў іх творчасці атрымалі тэмы Радзімы, сацыялістычнай рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны, вобраз У.І.Леніна, жыццё савецкага чалавека, яго мірную працу. Шэраг цудоўных музычных твораў, якія ўвабралі ў сябе усё каштоўнае, што стварыў за сваю шматвекавую гісторыю беларускі народ,напісалі вядомыя беларускія кампа-



зітары М.Аладаў, Я.Цікоцкі, А.Туранкоў, Р.Пукст, Д.Лукас, А.Багатыроў, Я.Глебаў, Ю.Семяняка, Д.Смольскі, Г.Вагнер, І.Лучанок, П.Падкавыраў, У.Алоўнікаў, С.Картэс і многія іншыя.

За стварэнне цудоўных патрыятычных песень беларускія кампазітары У.Алоўнікаў, Я.Глебаў, В.Буднік, Ю.Семяняка, Д.Смольскі, Л.Захлеўны, Э.Зарыцкі, Э.Ханок былі ўдастоены высокай узнагароды -- прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, а І.Лучанок стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР, прэміі Ленінскага камсамола і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Новымі цудоўнымі дасягненнямі азнаменаваў сваю дзейнасць вялікі дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР. На яго сцэне былі пастаўлены оперы "Алеся" Я.Цікоцкага, "Новая зямля", "Зорка Венера", "Калючая ружа", "Каліападае лісце" Ю.Семянякі, "Сцежкаю жыцця" Г.Вагнера, балеты "Альпійская балада", "Выбранніца" Я.Глебава, "Пасля балю", "Святло і цені" Г.Вагнера. Яркая тэатральная форма ў гэтых творах спалучалася з грамадзянскасцю і публіцыстычнасцю, што дало тэатру магчымасць вырашаць складаныя творчыя задачы.

Акрамя твораў беларускіх аўтараў, у тэатры оперы і балета былі пастаўлены оперы "Кастрычнік" В.Мурадзелі, "Брэсцкая крэпасць" К.Малчанава. Яркай падзеяй сталі балеты "Золушка" С.Пракофьева, "Спартак" А.Хачатурана, "Шчаўкунчык" П.Чайкоўскага, "Сатварэнне свету" А.Пятрова ў пастаноўцы балетмайстра, народнага артыста БССР В.Елізарьева.

Імёны вядучых майстроў беларускага балета і оперных спевакоў, народных артыстаў БССР: Л.Бржазоўскай, Н.Паўлавай, Ю.Траяна, В.Саркіс"яна, А.Саўчанкі, Л.Златавай, народнай артысткі ССС С.Данілюк і інш. вядомы далёка за межамі Савецкага Саюза.

Паспяхова працавалі калектывы Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы /мастацкі кіраўнік Р.Шырма/, Дзяржаўны народны хор БССР /мастацкі кіраўнік Г.Цітовіч/, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр БССР, Дзяржаўны народны аркестр БССР, Дзяржаўны ансамбль танца БССР, вакальна-інструментальны ансамбль "Песняры", "Верасы", "Сябры", фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Харошкі".

Актыўны творчы пошук перажывала беларускае выяўленчае мастацтва. Беларускімі мастакамі быў створаны шэраг работ, прысвечаных гісторыка-рэвалюцыйнай тэме: "Ленін у Кастрычніку", "З Леніным" А.Мазнева, "Напярэдадні" і трыпціх "Незабыўнае" К.Ка-

смачова, трыпціх "Сімфонія рэвалюцыі" А.Гугеля і Р.Кудрэвіч, "Беларусь", "За ўладу Саветаў" Н.Воранава, "І з"езд РСДРП" М.Манасзона і многія іншыя.

Працягвала развівацца тэма Вялікай Айчыннай вайны ў карцінах М.Савіцкага "Віцебскія вароты", "Партызанская мадона", "Партызаны", серыі карцін "Лічбы на сэрцы" і інш., "1941.Над Прыпяццю", "Салдаты", "Жанчынам Вялікай Айчыннай прысвячаецца" В.Грамыкі, "Мы вернемся", "Хатынь" А.Малішэўскага, "Маё нараджэнне" Л.Шчамялёва і іншых.

Атрымалі шырокую вядомасць карціны М.Савіцкага "Хлеб", "У полі, Г.Вашчанкі "Маё Палессе", А.Кішчанкі "Старшыня.1944", палотны Б.Аракчэева, І.Стасевіча, І.Ціханава, В.Літвінавай і іншыя.

Несумненнай удачы ў жанры партрэта дасягнулі мастакі М.Савіцкі, В.Стэльмашонак, В.Сахненка, Р.Кудрэвіч, Н.Счасная і іншыя.

Тонкім лірызмам, любоўю да беларускай прыроды прасякнуты пейзажы В.Цвіркі, Р.Ціхановіча, П.Масленікава, Я.Красоўскага, В.Крамыкі і іншых.

Шырокай і разнастайнай тэматыкай вызначалася беларускае скульптурнае мастацтва. У партрэтным жанры выдзяляюцца творы З.Азгура, Я.Глебава, А.Анікейчыка, Л.Гумілеўскага, Н.Рыжанкова, С.Вакара, Г.Мурамцава і інш. Лепшымі творамі манументальнай скульптуры з"яўляюцца Курган Славы Савецкай Арміі -- вызваліцельніцы Беларусі /скульптары А.Бембель, А.Арцімовіч, архітэктар Л.Стаховіч/, мемарыяльны комплекс "Хатынь" /скульптар С.Селіханаў, архітэктары В.Занковіч, Л.Левін, Ю.Градаў. Ленінская прэмія 1970 г./, манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі ў Жодзіна /Н.Рыжанкоў, А.Заспіцкі, І.Місько/, мемарыяльны комплекс "Прарыў" /скульптар А.Анікейчык, архітэктары Ю.Градаў і Л.Левін/, музей-помнік савецка-польскай баявой садружнасці ў Леніна /скульптар А.Цыгаль, архітэктар Я.Белапольскі/, мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" /кіраўнік творчага калектыву А.Кібальнікаў/, а таксама помнікі народным паэтам БССР Я.Купалу /А.Анікейчык, Л.Гумілеўскі, А.Заспіцкі/ і Я.Коласу /З.Азгур/ у Мінску, Ф.Скарыне ў Полацку /скульптар А.Глебаў, І.Глебаў, А.Заспіцкі, архітэктар В.Марокін/.

Творы, створаныя беларускімі майстрамі пэндзля і разца



сталі здабыткам нацыянальнай культуры.

У рэспубліцы паспяхова развівалася самадзейная творчасць: мастацкая самадзейнасць, дэкаратыўна-прыкладное і выяўленчае мастацтва, фота- і кінамастацтва. Толькі ў Першым Усесаюзным фестывалі самадзейнай, мастацкай творчасці працоўных /1975-1977 гг./ удзельнічала больш як 40 тысяч самадзейных творчых калектываў. Самым масавым відам народнай творчасці з"яўлялася мастацкая самадзейнасць. Неад"емнай часткай рэпертуараў большасці выканаўчых калектываў былі лепшыя ўзоры літаратурнай і музычна-песеннай творчасці Беларусі і іншых братніх рэспублік. Найбольш творча сталым калектывам прысвойваліся званні народных. Яны былі добра вядомыя не толькі ў рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. Мінскі народны мужчынскі хор Палаца культуры і тэхнікі аўтамабільнага завода, які неаднаразова гастраляваў у РСФСР, УССР, ПНР, ЧССР. У 1967 г. ён стаў лаўрэатам Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва ў гонар 50-годдзя Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у 1975--1977 гг. -- лаўрэатам І Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці. Лебедзеўская народная харавая капэла сельскага клуба Маладзечанскага раёна выступала перад працоўнымі рэспублікі, Масквы і саюзных рэспублік. Шырокай вядомасцю ў рэспубліцы карыстаўся Казловіцкі народны хор сельскага Дома культуры Слуцкага раёна, Прыбыткоўскі народны хор сельскага Дома культуры Гомельскага раёна і многія іншыя.

У рэспубліцы пастаянна праводзіліся раённыя, гарадскія, абласныя, рэспубліканскія выстаўкі твораў самадзейных мастакоў і народных умельцаў. У 1969--1985 гг. адбылося больш як 470 пастаянных і перасовачных выставак.

Дасягненні беларускага народа на шляхах сацыяльнага і культурнага развіцця ў 60-х -- сярэдзіне 80-х гадоў неаспрэчныя. Аднак узросшы ўзровень народнага дабрабыту, поспехі ў розных галінах культуры маглі б быць больш значнымі, калі б не памылкі і супярэчнасці, што накапіліся ў развіцці грамадства. Асабліва прыкметнымі яны сталі ў 70-я -- пачатку 80-х гадоў, калі Беларусь, як і уся краіна, стала губляць тэмпы руху наперад. У народнай гаспадарцы пачалі накаплівацца цяжкасці і нявырашаныя праблемы, з"явіліся застойныя з"явы.

Негатыўныя працэсы назіраліся і ў галіне культуры. Перш за ўсё гэта закранула сферы выкарыстання беларускай мовы ў грамадстве як мовы нацыянальнай. Рэзка скарацілася колькасць беларускіх школ, у гарадах рэспублікі іх амаль не засталося. Адмоўную ролю адыграла практыка вызвалення многіх дзяцей у школах ад вывучэння беларускай мовы. Фактычна яна была выцеснена з сярэдне-спецыяльнай і вышэйшай школы. Адначасова ішло скарачэнне колькасці перыядычных выданняў, кніг і брашур на беларускай мове. Вынікам гэтых з'яў стала падзенне цікавасці ў насельніцтва, асабліва моладзі, да нацыянальнай гісторыі, літаратуры і мастацтва. Развіццё культуры ў цэлым стрымлівалася недастатковым яе фінансаваннем, а таксама панаваннем камандна-адміністрацыйнай сістэмы.

## ЛІТАРАТУРА


Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. - Мн., 1975. - Т.5.

Гонцова С.К. Культурно-просветительные учреждения БССР: Воспитание нового человека. - Мн., 1985.

Лученок А.И. Новые условия хозяйствования и народное благосостояние. - Мн., 1986.

Марцелев С.В. К духовному расцвету. Исторический опыт развития белорусской советской культуры. - Мн., 1974.

Рост материального благосостояния и культуры белорусского народа. - Мн., 1969.

Сафонова О.В. Великий Октябрь и культурное строительство в БССР. - Мн., 1987.